РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ

# З павагай да свайго

**Апаратная нарада першага намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 29 жніўня.**

Дзякуючы сродкам відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

У Гарадку Віцебскай вобласці 2—3 верасня адбудуцца мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня беларускага пісьменства. Да іх з ліку рэспубліканскіх арганізацый сферы культуры далучацца Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У рамках святкавання пройдзе паказ фільма “На іншым беразе” і сустрэча з членамі здымачнай групы.

Акрамя таго, закраналася пытанне знешняга выгляду і зместу сайтаў устаноў культуры, прагучалі рэкамендацыі па выпраўленні недахопаў. Так, была адзначана неабходнасць прывядзення інтэрнэт-платформаў у адпаведнасць з заканадаўствам. Звярталася ўвага і на тое, што інфармацыя на старонках устаноў культуры мусіць рэгулярна абнаўляцца і быць актуальнай, аператыўнай і верагоднай.